# Вясенняя раніца

*Словы Міхася Чарота* *музыка Валянціна Каваліва*




репозиторий БГПУ

© В.В.Ковалив

Гляньце, дзеткі, у ваконца,
Ды пара ужо ўставаць.
Як прыгожа там бясконца,
Як прыгожа там бясконца.
Сорам, дзеткі, позна спаць!

Заглянула сонца ў вочкі,
Дзень прыйшоў, даволі сну.
На свет гляньце, галубочкі,
На свет гляньце, галубочкі,
Усе вітаюць там вясну.

Прыпеу: Пчоўкі выпаўзлі з калод
Збіраць мядок.
Шпак вартуе агарод
І наш садок.
Зяленее траўка,
Птушачкі пяюць.
Эх! Зімы не будзе,
Кветкі зацвітуць.

Устаньце, дзеткі, пойдзем у поле
Спевы слухаць, кветкі рваць.
У хаце сумна, бы ў няволі,
У хаце сумна, бы ў няволі,
Устаньце дзеткі, годзе спаць.

Вы зірніце ў ваконца,
Палюбуйцеся хаця:
Колькі волі, колькі сонца,
Колькі волі, колькі сонца,
Колькі новага жыцця!

Репозиторий БГПУ